Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 9 (632) Пятніца, 18 сакавіка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

*Нашы падарункі XXIII з'езду КПСС*

## САПРАЎДНЫЯ ЭНТУЗІЯСТЫ

Наша універсітэцкае таварыства «Веды» налічвае каля чатырохсот прапагандыстаў. Іх дзейнасць накіравана на выхаванне новага чалавека, ідэйна перакананага актыўнага будаўніка камунізма.

Асабліва ўзмацнілася дзейнасць нашых вучоных цяпер, калі набліжаюцца хвалюючыя для ўсяго савецкага народа даты — XXIII з'езд КПСС, 50-годдзе Савецкай улады і 100-годдзе з дня нараджэнне Ул. І. Леніна. Многа лекцый за мінулы месяц прачытана лектарамі па гісторыі КПСС.

Калі параўнаць колькасць іх за першыя месяцы мінулага года з цяперашняй, то яна ўзрасла на 60 працэнтаў. Асноўную ўвагу прапагандысты звяртаюць зараз на паказ таго, як расла, змагалася, вяла за сабой народныя масы наша Камуністычная партыя, расказваюць пра слаўных камуністаў—сыноў беларускага народа, пра іх мужнасць і адвагу ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Універсітэцкае таварыства «Веды» праводзіць пастаянную лекцыйную прапаганду на Мінскім аўтамабільным заводзе, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя С. М. Кірава і на многіх іншых прадпрыемствах горада Мінска, а таксама ў воінскіх часцях і універсітэце культуры для настаўнікаў. Філалагічны факультэт шэфствуе над факультэтам літаратуры і мастацтва, арганізаваным пры Палацы прафсаюзаў. Юрыдычны факультэт праводзіць рэгулярныя заняткі ва універсітэце прававых ведаў, арганізаваных пры гаркоме партыі. Яшчэ большай частцы ведаўцаў прыходзіцца выязджаць у калгасы, саўгасы нашай рэспублікі. Мы стараемся забяспечыць арганізацыю лекцый на падшэфных прадпрыемствах і ў воінскіх часцях. У сваёй прапагандзе выкарыстоўваем такія новыя метады, як «дзень лектара», які мы праводзілі на аўтазаводзе.

Вялікая ўвага звяртаецца і на выезды агітбрыгад. Добра наладжвала іх, напрыклад, дацэнт Вера Анісімаўна Захарава.

Падрыхтоўка маладых лектараў з ліку аспірантаў і студэнтаў нашага універсітэта — важны сектар нашай работы. У нас арганізаваны школы маладога лектара і міжнароднікаў. Пытанне ідзе аб тым, каб кожны студэнт-выпускнік пайшоў на вытворчасць не толькі кваліфікаваным спецыялістам, але і актыўным прапагандыстам марксісцка-ленінскай тэорыі, ідэй нашай партыі. Актыўную дапамогу ў гэтым нам аказваў і аказвае партком і камітэт камсамола універсітэта.

Усілілася за апошні час наша лекцыйная прапаганда праз друк. (выступалі тт. Грабеннікаў, Шпадарук, Булацкі, Бондарава, Рожын, Бугаёў і многія іншыя нашы выкладчыкі і аспіранты). Нам неабходна ўзмацніць сувязь з газетамі і часопісамі, што дасць магчымасць яшчэ больш удасканаліць наша лектарскае майстэрства.

**М. Я. РЭЗНІКАЎ,**
дацэнт, старшыня праўлення таварыства «Веды».

## СУСТРЭЧА З НАРОДНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ



*НА ЗДЫМКУ: Міхась Ціханавіч ЛЫНЬКОЎ дае аўтографы студэнтам.*
*Фота С. СУПРУНА.*

Літаратурны вечар, які адбыўся ў актавай зале філалагічнага факультэта нашага універсітэта, сабраў поўную аўдыторыю. На сустрэчу са сваімі чытачамі прыйшоў Народны пісьменнік Міхась Ціханавіч Лынькоў. Ён сустрэўся з будучымі выкладчыкамі літаратуры — з тымі, хто не толькі ведае і любіць яго кнігі з дзяцінства, але і будзе неўзабаве выхоўваць на мастацкіх творах новыя пакаленні школьнікаў.

Студэнты-філолагі, выкладчыкі універсітэта і ўсе, каму пашчасціла трапіць на вечар, апладысментамі і кветкамі сустрэлі любімага пісьменніка. У прывітальным слове пачуцці любві і пашаны да народнага пісьменніка ад імя ўсіх прысутных выказаў дэкан філалагічнага факультэта Р. Булацкі.

Народны пісьменнік падзяліўся сваімі думкамі аб стане сучаснай беларускай літаратуры напярэдадні V з'езда пісьменнікаў Беларусі, выказаў меркаванні аб перспектывах росту і развіцця нашай літаратуры.

На сустрэчы выступілі маладыя паэты, члены універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт» — М. Дукса, Ул. Дзюба, М. Вяршынін, А. Казловіч, Ю. Голуб.

Сустрэча са студэнтамі — яшчэ адзін прыклад трывалай і рознабаковай сувязі народнага пісьменніка з яго чытачамі. Напярэдадні XXIII з'езда КПСС і перад чарговым з'ездам літаратараў Беларусі пісьменнік-камуніст Міхась Лынькоў прыйшоў да чытача са сваімі думкамі і творчымі падрахункамі.

### У ПАРТКОМЕ

**У сераду, 16 сакавіка, адбылося пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта. Разам з іншымі вырашылася арганізацыйнае пытанне. У сувязі з пераходам І. М. Ігнаценкі на іншую работу, ён вызвален ад абавязкаў сакратара партыйнага камітэта. Сакратаром парткома аднагалосна выбрана Т. Я. Дударава, якая з'яўлялася да гэтага намеснікам сакратара парткома па арганізацыйна-партыйнай рабоце.**

**Абавязкі намесніка сакратара парткома па арганізацыйна-партыйнай рабоце даручана выконваць члену парткома А. Ц. Пікулёву.**

## ШТАБ ЦАЛІННАГА СЕМЕСТРА

**11 сакавіка гэтага года адбылося чарговае пасяджэнне камітэта камсамола нашага універсітэта, на якім быў зацверджан штаб працоўных спраў цаліннага семестра 1966 года. У штаб увайшло дзевяць чалавек. Абавязкі паміж імі размеркаваны наступным чынам:**

**М. ТРАЦЬЯК — чацверты курс фізфака — начальнік штаба;**

**А. ЯРОХІН — другі курс філфака — намеснік начальніка штаба па палітычнай частцы;**

**Члены штаба:**
**М. КУЧЫНСКІ — чацверты курс фізфака;**
**І. ЦВІРКО — чацверты курс фізфака;**
**М. ПАСТУХОЎ — трэці курс матфака;**
**А. АЛЯШКЕВІЧ — трэці курс матфака;**
**А. ТРАСКУНОЎ — чацверты курс гістфака;**
**А. СЛУКА — другі курс філфака;**
**І. КАВАЛЕНКА — другі курс юрфака.**

**У гэтым годзе 400 нашых студэнтаў зноў паедуць на будоўлі Казахстана. Хутка вернуцца назад нашы пасланцы — Ул. Вялічка, А. Бяссонаў, І. Цвірко, якія камандыраваны камітэтам камсамола для заключэння працоўных дагавораў з калгасамі і саўгасамі Уральскай вобласці.**

**Каля 200 камсамольцаў мяркуе камітэт камсамола паслаць на будоўлі нашай рэспублікі.**

**Акрамя гэтага, пасля заканчэння вясновай экзаменацыйнай сесіі многіх камсамольцаў нашага універсітэта чакае праца на стадыёне «Дынама».**

**Як бачым, спраў у тых, хто не баіцца працаваць, у гэтым годзе хопіць.**

**Будоўлі нашай краіны чакаюць цябе, камсамолец, і ты ўжо цяпер рыхтуй сябе да будаўнічага семестра.**

## НАШЫ ГОСЦІ

Днямі па запрашэнню камітэта камсамола нашага універсітэта да нас са шчырым прывітаннем і песнямі прыехала вялікая група аматараў мастацкай самадзейнасці Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта. Адбылася гарачая сустрэча паміж студэнтамі універсітэтаў дзвюх братніх рэспублік. Літоўскія госці азнаёміліся з нашым універсітэтам, хоць, праўда, многія з іх ужо не раз пабывалі ў нас.

А вечарам у актавай зале літоўцы давалі вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Зала ўрачыстая, многагалосая была перапоўнена. І гэта не выпадкова. Нашы студэнты даўно ўжо ведаюць, што ансамбль песні і танца Вільнюскага універсітэта сваёй народнасцю, самабытнасцю выканання заваяваў высокую ацэнку слухача. У гэтым яшчэ раз пераканаліся нашы студэнты.

Па запрашэнню вільнюскіх сяброў з адказным візітам неўзабаве паедуць да іх аматары мастацтва нашага універсітэта.

**С. СВОРАБ.**

* * *

*Днямі наш універсітэт прымаў дэлегацыю Саюза Свабоднай нямецкай моладзі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Госці сустрэліся з камсамольскім актывам універсітэта, азнаёміліся з работай камітэта камсамола, наведалі вучэбныя карпусы, аўдыторыі, пабывалі ў бібліятэцы, актавай зале, лабараторыях, кабінетах. Перад сябрамі выступіў прарэктар па навучальнай частцы А. Я. Малышаў. Ён расказаў ім аб традыцыях універсітэта, яго гісторыі і вучобе нашага студэнцтва.*

*У заключэнне госці сустрэліся са зборнай універсітэта па валейболу.*

*Нямецкая моладзь уручыла камітэту камсамола нашага універсітэта памятны падарунак. Свае сувеніры падаравалі гасцям і нашы студэнты.*

*А. ЯРОХІН.*

## СТАРТУЕ ЛЕНІНСКАЯ ЭСТАФЕТА

Бадай, з найбольшай актыўнасцю ўключыліся ў эстафету камсамольцы філфака. Па сутнасці, эстафета сваім нараджэннем абавязана іменна гэтаму факультэту. Яшчэ дваццаць чацвертага кастрычніка 1965 года студэнты філфака абвясцілі камсамольскую двухгодку. У яе ўвайшлі такія пытанні, як выхаванне моладзі на баявых традыцыях партыі і народа, глыбокае вывучэнне тэарэтычнай спадчыны Ул. І. Леніна, развіццё актыўнасці камсамольцаў, барацьба за паспяховасць. Гэта значыць, узняты былі пытанні, якія знайшлі сваё адлюстраванне і ў эстафеце.

Усё больш і больш камсамольцаў філфака ўцягваецца ў грамадскую работу. Пытанне «пасіва» і «актыва» рашаецца паспяхова. Напрыклад, з 600 членаў ВЛКСМ факультэта 500 маюць пастаянныя грамадскія даручэнні, а астатнія — часовыя. Магчыма, гэтыя лічбы выклікаюць у некаторых недаверлівую ўсмешку, але справы склаліся іменна так. Як жа дабіўся камітэт камсамола факультэта такой масавасці? Галоўным чынам праз палепшанне ўнутрыарганізацыйнай работы курсаў і груп. Вялікае значэнне тут прыдаецца кантролю за выкананнем грамадскіх даручэнняў камсамольцамі. Для гэтага створана спецыяльная камісія, у рабоце якой прымаюць удзел не толькі члены камітэта, але і камсамольцы груп.

Цікава адзначыць і тое, што камсамольцы факультэта нярэдка выносяць сваю работу за рамкі універсітэта. Праводзяць цікавыя сустрэчы з рабочай моладдзю фабрык і заводаў, выступаюць з канцэртамі ў саўгасах і калгасах, перапісваюцца з камсамольскімі арганізацыямі іншых школ, дапамагаюць ім у стварэнні музеяў Ул. І. Леніна. Усе групы факультэта актыўна ўключыліся ў барацьбу за дастойную сустрэчу ленінскіх дзён, за выкананне камсамольскай двухгодкі, спаборнічаюць паміж сабой. Шмат яшчэ чаго цікавага можна было б расказаць пра жыццё камсамольцаў філфака. Але паглядзім, як ідуць справы на іншых факультэтах?

Актыўна ўключыліся ў эстафету і камсамольцы фізфака. Па-новаму яны пачынаюць будаваць сваю ідэалагічную работу. Масавыя мерапрыемствы праходзяць у выглядзе маёвак, на якіх абмяркоўваюцца праблемныя артыкулы газет і часопісаў. Наладжваюцца тэматычныя камсамольскія сходы. Днямі будзе праведзена праверка выканання камсамольцамі грамадскіх даручэнняў. Створана спецыяльная камісія пры камітэце камсамола факультэта для кантроля наведвання лекцый і паспяховасці студэнтаў. Вялікае значэнне тут удзяляецца працоўнаму выхаванню. 200 камсамольцаў факультэта паедзе працаваць на цаліну, каля 150 на будоўлі нашай рэспублікі. Ва ўсіх групах праходзяць сходы, тэма якіх «Грамадская дзейнасць Ул. І. Леніна».

Інакш абстаяць справы на хімфаку. Хоць варта адзначыць: у параўнанні з папярэднім годам камсамольская работа на хімфаку значна ажывілася. Камсамольцы-хімікі выклікалі спаборнічаць біёлагаў. На факультэце ствараецца летапіс: «Слаўныя справы камсамоліі хімфака». Але, па сутнасці, камсамолія хімфака толькі пачынае ўключацца ў эстафету. Многія тут лічаць, што галоўнае—прагаласаваць, а астатняе зробіцца само па сабе ці камітэтам камсамола і сакратаром С. Стройкіным.

Хочацца верыць, што такое становішча камсамольскага жыцця на хімфаку зменіцца і пра яго таксама, як і пра філолагаў, можна будзе сказаць: «Так трымаць і надалей!»

**А. ТАБАЧНІКАЎ.**

### Юнакам і дзяўчатам В'етнама —чыстае неба!

Кожны дзень тэлетайпы прыносяць трывожныя весткі з В'етнама. Пентагонаўскія ваякі сілай зброі, сілай сучаснай ваеннай тэхнікі, ракетнымі снарадамі, напалмавымі бомбамі спрабуюць задушыць свабодалюбівасць в'етнамскага народа.

Сурова асуджаюць студэнты, аспіранты, прафесарска-выкладчыцкі калектыў нашага універсітэта агрэсіўную вайну ЗША ў В'етнаме:

— Юнакам і дзяўчатам В'етнама—чыстае неба, — патрабавалі яны на мітынгу, які адбыўся 16 сакавіка ў актавай зале галоўнага корпуса. — Мы заўсёды з вамі, в'етнамскія браты!..

На мітынгу выступілі таксама замежныя студэнты, што навучаюцца ў нашым універсітэце,—Барыс Ла Сэрца (Куба), Нгуен Куанг Мінь (В'етнам) і многія іншыя.

# ЁН БЫЎ ПЕРШЫМ РЭКТАРАМ БДУ

Сваю работу па гісторыі нашай краіны Уладзімір Іванавіч Пічэта пачаў яшчэ да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Яго першая друкаваная праца выйшла у 1904 годзе. У 1910 годзе Ул. І. Пічэта здаў магістарскі экзамен пры Маскоўскім універсітэце, пасля чаго прыступіў да падрыхтоўкі сваёй магістарскай дысертацыі, якую абараніў у 1917 годзе. Але напружаная яго навуковая дзейнасць пачалася толькі ў савецкі час, і гэта вызначыла метадалогію яго даследаванняў і іх тэматыку.

У 1910 годзе ён напісаў навукова-папулярны нарыс гісторыі Вялікага княства Літоўскага да Люблінскай уніі і надрукаваў яго ў «Рускай гісторыі ў нарысах і артыкулах», якая выходзіла пад рэдакцыяй прафесара Доўнар-Запольскага.

Вынікам далейшых паглыбленых даследаванняў была капітальная двухтомная манаграфія «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», за якую Ул. І. Пічэту былі прысуджаны ступені магістра (1917 г.) і доктара гістарычных навук (1918 годзе).

Гісторыю Беларусі вывучалі амаль выключна ў сувязі з гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, у склад якога некалі ўваходзілі беларускія землі, альбо з даследаваннямі ўсходнеславянскіх плямён, сярод якіх былі і продкі беларускага народа. Уладзімір Іванавіч першым паставіў пытанне аб гісторыі беларускага народа і многа зрабіў для яе вырашэння. Доўгі час Ул. І. Пічэта быў цесна звязаны з Беларуссю: з 1921 па 1930 г. ён быў рэктарам і прафесарам універсітэта ў Мінску, а з 1928 г. і да смерці — сапраўдным членам Беларускай Акадэміі навук. Гэтыя абставіны садзейнічалі паглыбленню яго навуковай цікавасці да мінулага Беларусі. Характэрна, што гэтая цікавасць паявілася не з моманту яго прызначэння ў Беларускі універсітэт, а значна раней. Яшчэ ў 1918 годзе ён чытаў у Маскве курс гісторыі Беларусі.

На першым плане ва Уладзіміра Іванавіча стаяла пытанне вывучэння сацыяльна-эканамічных з'яў. Яму належыць спецыяльная манаграфія «Гісторыя сельскай гаспадаркі і землекарыстання ў Беларусі да канца XVI ст.» (1927 г.) і шмат артыкулаў аб аграрным руху і класавай барацьбе ў Беларусі ў XIX і пачатку XX в.

Разам з вывучэннем сацыяльна - эканамічных з'яў Ул. І. Пічэта ўдзяляў вялікую ўвагу і гісторыі беларускай культуры. У гэтым выявілася адна з рыс Уладзіміра Іванавіча, якая рабіла такімі прывабнымі навуковыя і таварыскія гутаркі з ім. Ён ніколі не адносіўся да прадмета сваіх даследаванняў абыякава. Ул. І. Пічэта любіў Беларусь, любіў беларускі народ, ярка адчуваў цяжкасці, якія гэты народ цярпеў у мінулым, і радаваўся шчасцю, якое наступіла для беларусаў у нашы дні. Любоў да беларускага народа знайшла сваё адлюстраванне і ў той выключнай цікавасці, якую Уладзімір Іванавіч праяўляў да яго культуры, да яго пісьменнасці, да яго мовы.

У 1924 годзе ён надрукаваў артыкул пра беларускую мову як фактар нацыянальнай культуры. Ён пісаў пра росквіт беларускай культуры ў XVI ст., пра так званае «беларускае адраджэнне». Ён прысвяціў некалькі прац стваральніку беларускай літаратурнай мовы і беларускага кнігадрукавання Францішку Скарыне. У адным са сваіх артыкулаў 1928 года пра вышэйшую школу Беларусі ў XIX—XX ст. ст. Ул. І. Пічэта паказваў, як беларускі народ змагаўся пры царызме за права мець сваю школу.

Ул. І. Пічэта ніколі не быў кабінетным вучоным, ён любіў падзяліцца сваімі навуковымі назіраннямі, шчодра выкладаў свае веды і ў гутарках, і ў спрэчках, і на абаронах дысертацый. Выключную ролю маюць яго выступленні ў якасці апанента. Многія з іх засцэнаграфаваны і заслугоўваюць друкавання. У гэтых выступленнях ён заўсёды рабіў вялікае ўражанне веданнем архіўных матэрыялаў і літаратуры. Не было амаль ніводнага пытання з гісторыі СССР, па якім ён не змог бы ўказаць які-небудзь ім прагледжаны архіўны фонд ці малавядомую кнігу. Да кожнага пытання ён падыходзіў з пазіцый марксісцкай ідэалогіі. Ён патрабаваў шырокага ведання літаратуры і даваў у сваіх працах, выступленнях бліскучы прыклад знішчальнай крытыкі замежнай буржуазнай літаратуры.

**С. В. БАХРУШЫН,**
**Вучоныя запіскі інстытута славяназнаўства Акадэміі навук СССР.**
**Том І, 1949 г.**

# НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

Група народнага кантролю сумесна з камендантам галоўнага корпуса зрабіла агляд аўдыторый, кабінетаў, лабараторый і ўсіх дадатковых памяшканяў да галоўнага корпуса нашага універсітэта. Пры аглядзе прысутнічалі прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў. Народныя кантралёры праверылі, наколькі правільна выкарыстоўваюцца памяшканні галоўнага корпуса.

Устаноўлена, што адведзеныя аўдыторыі для гістарычнага і матэматычнага факультэтаў перагружаны. У сувязі з недахопам вучэбнай плошчы, выкарыстоўваюцца кабінеты. Асобныя кафедры наогул не маюць сваіх памяшканняў.

Значную частку галоўнага корпуса займае фізічны факультэт, у васемнаццаці адведзеных для яго пакоях размяшчаюцца аўдыторыі, вучэбныя і навуковыя лабараторыі, кабінеты, кафедры. Усе загадчыкі кафедраў маюць свае асобныя кабінеты. Вельмі вялікую плошчу займаюць кабінеты методыкі фізікі (пакоі № 417, 419).

Пакой № 304 (кафедра электрафізікі) займае толькі адзін аспірант, пакой № 358 (кафедра эксперыментальнай фізікі) — два аспіранты, але дакладна ўстанавіць, кім і калі яны выкарыстоўваюцца, не ўдалося: пакой быў увесь час закрыты. Прыкрым тут з'яўляецца тое, што кафедра вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, якая налічвае ў сваім складзе каля дваццаці чалавек, не мае свайго памяшкання. Не маюць таксама сваіх кабінетаў і дзве кафедры юрыдычнага факультэта.

Многія пакоі фізічнага факультэта былі наогул закрыты і паглядзець, як яны выкарыстоўваюцца, не ўдалося. Асобныя памяшканні фізічнага факультэта пераўтвораны ў склады і знаходзяцца ў дрэнным становішчы. Гэта пакоі №№ 701, 702, 703.

Народныя кантралёры выявілі таксама, што загадчык кафедры дацэнт А. Н. Пісарэўскі зачыніў сваім замком аўдыторыі №№ 601 і 602, а мэбля невядома чаму вынесена ўся на калідор. Па ўказанню дэкана фізічнага факультэта вучэбна-эксперыментальная майстэрня робіць перагародку—з тым разлікам, каб адасобіць частку калідора, які прымыкае да гэтых аўдыторый. Толькі пасля ўказання рэктара універсітэта дацэнт А. Н. Пісарэўскі вымушаны быў зняць замкі і пакінуць завіхацца каля перагародкі.

Група народнага кантролю просіць рэктара універсітэта спецыяльна разгледзець пытанне аб размеркаванні і выкарыстанні памяшканняў галоўнага корпуса ў навуковых і вучэбных адносінах. Пры разглядзе гэтага пытання трэба звярнуць асаблівую ўвагу на недахоп вучэбных памяшканняў на юрыдычным факультэце.

**А. ГАЛАЎКО.**

*Рэгулярна парткомам і камітэтам камсамола ў рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» праводзяцца семінары з рэдактарамі насценных газет нашага універсітэта.*

*НА ЗДЫМКУ вы бачыце ўдзельнікаў семінару.*

Фота *А. Кадзета.*



# Клопаты мастацкай самадзейнасці

## АБЯЦАНКА-ЦАЦАНКА, АБЫ ГОЛАС ДОБРЫ БЫЎ

Наша Народная харавая капэла ў мінулым годзе ўдзельнічала ў 111 дэкадзе самадзейнага мастацтва БССР. Выступілі добра — атрымалі дыплом 11-ой ступені. Тады і рэпетыцыі праходзілі з пад'ёмам. Было ў кожнага нейкае нязвычайнае імкненне, мэта і прага дабіцца, дасягнуць яе. І дасягнулі.

Але што ж адбылося далей? Перад удзельнікамі калектыву паставілі новую задачу: для выступленняў падрыхтаваць рэпертуар, які б адпавядаў самым высокім запатрабаванням. Рыхтаваліся з запалам. Усе чакалі: вось, вось харавая капэла выедзе ў запланаваную паездку. Але паездка засталася толькі абяцанкай. Мільгануў месяц, другі — пачаўся новы навучальны год, і ніхто нікуды не паехаў. Спяваць для сябе? Каму гэта ўсё патрэбна? Дзеля чаго гэтулькі працаваць?

Цяпер нам абяцаюць паездку ў Адэсу. Людзі зацікавіліся, справы павярнуліся да лепшага, заняткі пачалі ўваходзіць у свой ранейшы тэмп. Будзем спадзявацца, што гэта паездка адбудзецца. Аднак, «будзем спадзявацца» — не тое слова. Мы верым, што нашы песні і танцы пачуюць і ўбачаць не толькі нашы сябры-студэнты з Адэсы, але і моладзь другіх гарадоў.

Зборы ў паездку далі штуршок і другім калектывам. Хаця, напрыклад, студэнцкі тэатр, упершыню арганізаваны ў гэтым годзе, займаецца і без таго напружана. Для першай пастаноўкі выбрана п'еса прагрэсіўнага амерыканскага драматурга Артура Лорэнтаса «Вестсайдская гісторыя», якая за кароткі час заваявала сусветнае прызнанне. У жанры музычнай драмы — гэта складаная рэч і яна адразу зацікавіла ўдзельнікаў студэнцкага тэатра. Праўда, не ўсе адразу паверылі ў магчымасць пастаноўкі «Вестсайдскай гісторыі» студэнцкімі сіламі. Але з кожнай новай рэпетыцыяй усё больш ярчэй і ярчэй ажываюць вобразы, і як вынік—расце ўпэўненасць у сваіх сілах. Немалая заслуга ў гэтым кіраўніка А. М. Возерава. І ўсё было б выдатна, але... не хапае людзей. Асабліва на мужчынскія ролі. Для п'есы трэба 46 чалавек, з іх 26 юнакоў. А яны да нас не ідуць. Можна падумаць, што наш універсітэт выключна дзявочая ўстанова. Адзначу, што такое становішча склалася не толькі ў драматычным калектыве, але і ў капэле, і ў танцавальным гуртку.

Што датычыцца апошняга (кіраўнік Л. К. Алексютовіч), то там проста катастрафічнае становішча. Мы даўно не бачылі ўжо новых танцаў. Некалькі чалавек з мінулагодняга складу не могуць вынесці на сваіх плячах увесь цяжар выступленняў. А новенькіх няма.

Адзін калектыў, у якога ўсё ідзе гладка — гэта аркестр Народных інструментаў (кіраўнік М. А. Лісіцын). Аб гэтым пісалася ў адным з нумароў нашай газеты.

Усё вышэй сказанае адносіцца да калектываў акадэмічнага жанру. Аб эстрадзе нічога нават і гаварыць не хочацца. Нельга ж лічыць аўральна развучаныя перад самым канцэртам нумары за эстраду. Яна даўно ўжо ў нас страціла сваю самабытнасць. У ёй не засталося нічога студэнцкага, калі наогул лічыць, што ў ёй што-небудзь ёсць. Усе памятаюць польскі студэнцкі калектыў «Гібрыды». Успамінаючы іх, я не хачу, сказаць, што ў іх ідэальная праграма. Не. Але ёсць самабытнасць, матэрыял сапраўды па-студэнцку самадзейны. Паглядзімо цяпер, якое становішча ў нас ва універсітэце. Ці было што-небудзь цікавае за апошні час? Не. Толькі на фізічным факультэце быў пастаўлены «Архімед», дык і то вельмі ж даўно, каб аб гэтым успамінаць цяпер.

Не лепшае становішча і на юрфаку. З гэтага факультэта ў капэлу ў мінулым годзе хадзілі многія, але затым развярнулася шырокая кампанія за свой уласны хор. Атрымалася, як у студэнцкай частушцы:

Нічога, што няма слыху,
Абы голас моцны быў...

З універсітэцкіх калектываў пачалі знікаць студэнты юрфака.

Так далей нельга Нельгаператвараць кожны факультэт універсітэта ў асобныя рэспублікі. Праўленне клуба задумала стварыць вялікі эстрадны калектыў, які мог бы даваць канцэрты на некалькіх факультэтах адразу, падзяліўшыся на асобныя брыгады. Гэта, на маю думку, дасць магчымасць зноў нам больш цесна аб'яднацца і падняць універсітэцкую самадзейнасць на высокі мастацкі ўзровень.

**В. ФАЦЕЕВА.**

# *Наш хакей*

Закончыліся І-ыя Усебеларускія спартыўныя ігры, прысвечаныя XXIII з'езду КПСС. І канькабежцы, і лыжнікі, і хакеісты нашага універсітэта зрабілі многае для таго, каб калектыў у цэлым заняў агульнае III месца. Аб майстэрстве лыжнікаў і канькабежцаў універсітэта вядома многае. Яны даўно зарэкамендавалі сябе, як адны з самых мацнейшых сярод вну рэспублікі. Але, калі на спаборніцтвах паявілася хакейная каманда універсітэта — многія здзівіліся. Яно і не выпадкова, бо хакейная каманда ў нас створана ўпершыню.

Першыя каляндарныя матчы паказалі, што каманда толькі-толькі становіцца на ногі. Не буду многа пісаць пра кожную сустрэчу, скажу пра гэту: БДУ — Гомельскі педінстытут. Першы перыяд 3:0, другі 3:0, трэці 4:0 у карысць нашай каманды. Першая бліскучая перамога.

Перамогі мы больш не дабіліся ні ў адной з каманд. Супернікі ігралі тэхнічней. Але няўдачы нашай каманды перш за ўсё залежалі ад таго, што ў нас не было замены. У нас не было нават дзвюх поўных пяцёрак. Таму атрымлівалася, што ў першых перыядах наша каманда не толькі стрымлівала націск суперніка, але і часам перамагала яго, але вось у канцы другога і трэцяга — нашы хлопцы стамляліся так, што пра тэхніку ігры і гаварыць не хочацца. Таму галоўнае зараз для нас стварыць паўнацэнную замену. Ужо даўно нам абяцаюць абсталяваць хакейную пляцоўку ля інтэрната па вуліцы Кастрычніцкай, але вынікаў пакуль што няма ніякіх.

На спаборніцтвах мы занялі чацвертае месца. Нападаючы нашай каманды Анатоль Гусеў—самы лепшы бамбардзір турніра.

**Ул. МАСЛОЎСКІ,**
**член зборнай па хакею.**

**Рэдактар А. ЛОЙКА.**

АТ 00819 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ Імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19.** **Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. № 404.